БИБЛИОТЕКА БГУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ "Залатая літара" ў намінацыі "Найлепшая шматтыражная газета"

29 чэрвеня 2009 года, № 12 (2005)

НАШЫ ГОСЦІ

ЖОРЭС АЛФЁРАЎ У БДУ

Лаўрэат Нобелеўскай прэміі, ганаровы прафесар БДУ акадэмік Жорэс Алфёраў 22 чэрвеня наведаў Белдзяржуніверсітэт.

Сусветна вядомы вучоны ўдзельнічаў у працы 17-га Міжнароднага сімпозіума "Нанаструктуры: фізіка і тэхналогіі" на базе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і ахвотна адгукнуўся на прапанову рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі выступіць перад супрацоўнікамі і студэнтамі альма-матэр.

У імправізаванай прамове Жорэс Іванавіч распавёў пра свой жыццёвы досвед і шлях у навуку, а таксама падзяліўся бачаннем перспектыў навукі і прапанаваў рашэнне задач падрыхтоўкі навуковых кадраў. Апошнія гады, па прызнанні Ж. Алфёрава, ён займаецца пераважна адміністрацыйнай працай і сканцэнтраваўся на арганізацыі дзейнасці створанага ім пры РАН Акадэмічнага універсітэта, які развівае магістратуру і аспірантуру. Вялікім дасягненнем БДУ, па словах ганаровага госця, з'яўляецца наяўнасць у яго структуры Ліцэя, дзе адбываецца першапачатковае далучэнне моладзі да навукі і вядзецца яе мэтанакіраваная падрыхтоўка.

Распавядаючы пра гісторыю савецкай навукі, Жорэс Алфёраў з вялікай павагай выказаўся пра выбітнага фізіка Антона Нікіфаравіча Сеўчанку, былога рэктара БДУ, і іншых прыкметных беларускіх навукоўцаў – яго паплечнікаў і паслядоўнікаў, узгадаў іх значныя дасягненні.

Не засталіся без увагі вучонага і сённяшнія рэаліі. На яго думку, самае галоўнае ва ўмовах крызісу – гэта развіццё навуковых даследаванняў. Пры гэтым важна не дзяліць акадэмію і універсітэты і здзяйсняць рэформы эвалюцыйным шляхам.

Жорэс Алфёраў з'яўляецца выхадцам з Беларусі, нарадзіўся ў Віцебску ў 1930 г. Адразу пасля вайны сям'я пераехала ў Мінск, дзе ў старэйшых класах Ж. Алфёраў захапіўся фізікай. Скончыўшы школу з залатым медалём, без уступных іспытаў быў залічаны на факультэт электроннай тэхнікі Ленінградскага электратэхнічнага інстытута імя У.І. Ульянава (ЛЭТІ). Праславіўся як спецыяліст у галіне фізікі паўправаднікоў, паўправадніковай і квантавай электронікі, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы.

Сяргей ШАФАЛОВІЧ

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

УШАНАВАННЕ

Ганаровы Хайме Хіль Алуха

Дыплом "Ганаровы прафесар БДУ" ўручаны 15 чэрвеня на пасяджэнні Вучонага савета нашага універсітэта прэзідэнту Іспанскай Каралеўскай Акадэміі эканомікі і фінансаў, прафесару Барселонскага універсітэта Хайме Хіль Алуха.

Х.Х. Алуха даўно і плённа супрацоўнічае з нашай ВНУ. Па яго ініцыятыве яшчэ ў 1992 г. падпісана дамова аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Барселонскім універсітэтам – адна з першых у сістэме адукацыі краіны пасля здабыцця дзяржаўнага суверэнітэту. У рамках гэтай дамовы праводзіліся сумесныя навуковыя семінары, лекцыі, стажыроўкі супрацоўнікаў. Хайме Хіль Алуха як прэзідэнт розных міжнародных асацыяцый ініцыяваў правядзенне ў БДУ буйных міжнародных навуковых канферэнцый. На кафедры матэматычнага забеспячэння АСУ ФПМІ (загадчык – прафесар Віктар Краснапрошын) у 1994-2000 гг. ажыццявілі пераклад яго 4-томнай манаграфіі "Новыя матэматычныя мадэлі і метады ў кіраванні" і шырока выкарыстоўвалі ў навучальным працэсе.

У сваім дакладзе на Вучоным савеце БДУ Хайме Хіль Алуха прадставіў ідэю стварэння новай каардынатнай сістэмы, здольнай вырашыць праблемы, з-за якіх пачаўся крызіс. Па яго словах, перад навукоўцамі на цяперашнім этапе стаіць задача распрацоўкі прагрэсіўнай мадэлі эканомікі ва ўмовах нявызначанасці і нестабільнасці з улікам сацыяльных патрэб грамадства.

Новы ганаровы прафесар БДУ падзякаваў навуковаму сходу за высокі гонар. Ён вельмі рады, што такім чынам адзначаны яго шматгадовыя высілкі па інтэграцыі беларускай навукі ў сусветную супольнасць, і спадзяецца на далейшае плённае супрацоўніцтва.

Даведка

Хайме Хіль Алуха – прэзідэнт Іспанскай Каралеўскай Акадэміі эканомікі і фінансаў, віцэ-прэзідэнт Іспанскай Каралеўскай Акадэміі дактароў, а таксама дзейны член шматлікіх міжнародных акадэмій і навуковых асацыяцый; ганаровы член Міжнароднай акадэміі інфарматыкі, Румынскай акадэміі навук, ганаровы доктар універсітэтаў Буэнас-Айрэса, Парыжа, Сафіі, прэзідэнт Міжнароднай навуковай асацыяцыі мадэлявання і імітацыі складаных сістэм, прафесар Барселонскага універсітэта. Аўтар больш як 30 кніг. За свае навуковыя дасягненні Х.Х. Алуха намінаваўся на Нобелеўскую прэмію ў галіне эканомікі.

Аляксандр КРАСЬКО

Чытайце ў нумары:

«У ЕЎРОПЕ НЯМА НАВУКОВАЙ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ БЕЛАРУСІ»

Інтэрв'ю з доктарам фізіка-матэматычных навук Сяргеем МАКСІМЕНКАМ, нядаўна абраным ганаровым членам міжнароднай навуковай супольнасці SPIE

Стар. 2

КУРЫВА ЦІ ЗДАРОЎЕ – НЕ МІФІЧНАЯ, А ЖЫЦЦЁВАЯ ДЫЛЕМА

Маніторынг сітуацыі, звязанай са спажываннем і распаўсюджаннем тытуню, на Беларусі і ў свеце

Стар. 4

ПЕРШЫ ГОД ПЛЁНАМ

У тэлецэнтры БДУ ідуць кастынгі, запіс праграм, запуск праектаў

Стар. 5

БАЛЬ ВЫПУСКНІКОЎ-2009

Чарговыя выхаванцы пакінулі сцены альма-матэр. У іх ліку названы "найлепшыя выпускнікі" і "зоркі" ад ўсіх вучэбных падраздзяленняў і ўстаноў БДУ

Стар. 6

Вестк і з рэктарата

РЭКТАР БДУ прафесар Сяргей Абламейка сустрэўся 24 чэрвеня з дэлегацыяй Іранскага касмічнага агенцтва. На сустрэчы былі абмеркаваны магчымасці супрацоўніцтва па праграме "Студэнцкі спадарожнік", а таксама пытанні, якія датычацца падрыхтоўкі і навучання студэнтаў і аспірантаў у галіне фізікі, прыкладной матэматыкі, механікі і іншых навук, звязаных з аэракасмічнай галіной.

***

НА БАЗЕ падрыхтоўчага аддзялення Інстытута бесперапыннай адукацыі наноў створаны факультэт дауніверсітэцкай адукацыі БДУ.

У яго структуры будуць аддзяленне для беларускіх грамадзян, аддзяленне для замежных грамадзян і Цэнтр вочна-завочнага дыстанцыйнага навучання (падрыхтоўчыя курсы). Кіраўніком падраздзялення прызначаны Вячаслаў МАЛАФЕЕЎ.

***

ПЕРСПЕКТЫВЫ партнёрства БДУ і Універсітэта Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў абмеркаваны 25 чэрвеня падчас візіту ў Мінск дэлегацыі гэтай арабскай ВНУ. Падпісана працоўная праграма ў адпаведнасці з пагадненнем аб супрацоўніцтве дзвюх ВНУ ад сакавіка 2007 года.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

НАШЫ ДАТЫ

ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ

Беларускі дзяржаўны універсітэт 29 чэрвеня традыцыйна ўшаноўвае памяць студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ, якія паклалі сваё жыццё за вызваленне Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Да пачатку вайны ў складзе БДУ было 6 факультэтаў і 33 кафедры. Усяго налічвалася: студэнтаў – 1400 чалавек, навуковых супрацоўнікаў – 151, адміністратыўна-тэхнічнага персаналу – 210 і вучэбна-дапаможнага персаналу – 1851 человек. У першыя дні вайны каля 450 студэнтаў і выкладчыкаў добраахвотнікамі пайшлі на фронт. Многія з тых, хто не паспеў эвакуявацца, сталі актыўнымі ўдзельнікамі партызанскага руху.

Сярод студэнтаў і выкладчыкаў Белдзяржуніверсітэта 12 Герояў Савецкага Саюза.

Нагадаем, што менавіта ў гэты дзень 68 гадоў таму планавалася ўрачыстае пасяджэнне Вучонага савета, прымеркаванае да дваццацігоддзя БДУ, але правядзенню юбілейных мерапрыемстваў перашкодзіла вайна.

Фота Аляксандра СНАПКА



Сяргей МАКСІМЕНКА:

Доктар фізіка-матэматычных навук, загадчык лабараторыі электрадынамікі неаднародных асяроддзяў НДІ ядзерных праблем БДУ Сяргей МАКСІМЕНКА першым з беларускіх навукоўцаў абраны ганаровым членам міжнароднай супольнасці аптычных інжынераў (SPIE Fellow) за ўклад у развіццё нанаэлектрамагнетызму. Пры сустрэчы мы папрасілі нашага вядомага фізіка растлумачыць сутнасць навуковай канцэпцыі і адказаць на некаторыя пытанні.

“У ЕЎРОПЕ НЯМА НАВУКОВАЙ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ БЕЛАРУСІ”

Нанаэлектрамагнетызм – новая навуковая дысцыпліна, якая аб’ядноўвае метады і падыходы класічнай электрадынамікі ЗВЧ і сучаснай квантавай фізікі кандэнсаванага стану і фізічнай электронікі з мэтай мадэлявання аптычных і электронных уласцівасцяў наноструктур (аб’ектаў або сістэм аб’ектаў памерам у адзінкі і дзесяткі нанаметраў). Наогул, нанаэлектрамагнетызм разглядае працэсы і з’явы, звязаныя з распаўсюджваннем і ператварэннем электрамагнітных хваль у наноструктурах.

Як распавёў Сяргей Афанасьевіч, група тэорыі нанаэлектрамагнетызму створана ў нашым НДІ ЯП у 1996-97 гг. Разам з Рыгорам Якаўлевічам Сляпянам была сфармулявана праблема разумення і прадказання незвычайных электрамагнітных уласцівасцяў наноструктур. Рэч у тым, што характэрныя памеры нанааб’ектаў значна меншыя за даўжыню хвалі аптычнага выпраменьвання, а электрон апынаецца паланёным у нанааб’екце. Таму ўзаемадзеянне нанаразмерных аб’ектаў са святлом істотна адрозніваецца ад таго, што існуе ў макрасвеце. Натуральна, змена ўласцівасцяў на мікраўзроўні прыводзіць да змены ўласцівасці аб’екта на макраўзроўні. У цэлым, праблемы нанаэлектрамагнетызму надзвычай важныя для прадказання ўласцівасцяў элементаў нанаразмерных ланцугоў і саміх ланцугоў. Гэта значыць, што іх рашэнне спрыяе агульнай тэндэнцыі развіцця мікраэлектронікі – руху ў бок мініяцюрызацыі электронных сістэм, павышэнню іх хуткадзейнасці і паменшэнню энергаспажывання. Нанаструктуры дазваляюць ствараць вельмі кампактныя электронныя схемы, што абяцае значны рывок у развіцці радыёэлектронікі (электронныя прылады, сродкі перадачы і апрацоўкі інфармацыі, стварэнне кампактных і хуткадзейных кампутараў, элементнай базы квантавых кампутараў).

– З якімі ўстановамі Вы супрацоўнічаеце найбольш цесна і дзе запатрабаваны Ваш вялізны досвед і веды?

– Мы ажыццяўляем шматгадовыя навуковыя даследаванні з калегамі з Новасібірскага Акадэмгарадка. Гэта Інстытут каталізу і Інстытут неарганічнай хіміі сібірскага аддзялення РАН, а таксама Новасібірскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт. Маем трывалыя сувязі з Пенсільванскім дзяржаўным універсітэтам (ЗША), а таксама з універсітэтам г. Намюр у Бельгіі. На дадзены момант па навуковай стыпендыі ДААД я працую з калегамі з Тэхнічнага універсітэта г. Берліна.

Апошнім часам мяне запрашалі для чытання лекцый у шанхайскім універсітэце і універсітэце г. Гуанчжоу, ва універсітэце г. Неапаля. Я і супрацоўнікі маёй лабараторыі рэгулярна ўдзельнічаем у міжнародных канферэнцыях. У якасці запрошанага дакладчыка ў сакавіку я выступаў у Аўстрыі на канферэнцыі па электронных уласцівасцях новых матэрыялаў. Зараз удзельнічаю ў 17-м Міжнародным сімпозіуме па наноструктурах у Мінску, а ў верасні мяне чакаюць на еўрапейскай мікрахвалевай канферэнцыі ў Рыме. Што тычыцца пастаяннай працы, у нашай лабараторыі выконваюцца заданні некалькіх ДКПНД, а таксама цэлы шэраг праектаў Рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў. Вынікі работы выкарыстоўваюцца пры чытанні курса лекцый на фізфаку. Акрамя таго, я з’яўляюся членам экспертнага савета ВАК і навуковых саветаў па комплексных дзяржпраграмах “Электроніка” і “Нанатэх”. Фінансаванне навуковай працы ў лабараторыі забяспечваецца і за кошт міжнародных грантаў, у тым ліку праз такую вядомую праграму, як INTAS. Нядаўна мы атрымалі каштоўнае абсталяванне па праграме навуковага камітэта NATO “Навука дзеля міру”. Зараз працуем над заключэннем гаспадарчых дамоў з расіянамі, а таксама рэалізуем двухбаковыя праекты з нямецкімі партнёрамі.

– Што Вы параілі б маладым вучоным для рэалізацыі свайго інтэлектуальнага патэнцыялу?

– Перш за ўсё шукаць навуковага кіраўніка – вучонага, які актыўна працуе. Адзін наш супрацоўнік перад тым, як прыйсці да нас у лабараторыю на працу, знайшоў маю дысертацыю, уважліва яе прачытаў, паглядзеў, дзе я з калегамі публікуюся. І гэты падыход цалкам правільны. У вучонага-пачаткоўца заўсёды павінен быць паравоз (выбачайце за параўнанне), які яго за сабой пацягне і ўвядзе ў свет сур’ёзнай навукі. У адваротным выпадку будзе вельмі складана. Фактычна так або інакш маладому чалавеку давядзецца прайсці гэты этап, але, магчыма, са спазненнем у некалькі гадоў або нават за мяжой. Пошук інфармацыі можна весці і праз Інтэрнэт. Сваю індывідуальны рэйтынг, так званы Н-фактар, які з’яўляецца значным інтэгральным сведчаннем персанальнага навуковага ўзроўню даследчыка.

На сайце *http://isiwebofknowledge.com* утрымліваецца спіс з некалькіх тысяч выданняў такога кшталту. “Веснік БДУ”, на жаль, не ўваходзіць у згаданы пералік. Я ні ў якім разе не супраць існавання гэтага часопіса. Ён вельмі карысны для маладых вучоных, якія распачынаюць свой шлях у навуцы. Але ў перспектыве трэба публікавацца ў больш прэстыжных выданнях. Калі ты прэтэндуеш на сур’ёзны праект, то павінен прад’явіць свой Н-фактар. Ведаю, што ў апошні час у БДУ вядзецца мэтанакіраваная праца ў дадзенай сферы. Было б варта ўсяляк фінансава падтрымліваць вучоных з Н-фактарам 10–12 і вышэй. Такім людзям можна смела даваць грошы на даследаванні. Наяўнасць высокага міжнароднага рэйтынгу – самы лепшы крытэрый для выяўлення здатнасці навукоўцаў і гарантыя рэалізацыі іх распрацовак.

– Існуе меркаванне, што ў пэўнай пасіўнасці беларускіх навукоўцаў вінаватыя аб’ектыўныя прычыны. Што Вы пра гэта думаеце?

– Я не лічу, што ў Еўропе ёсць навуковая дыскрымінацыя Беларусі. Прынамсі, у параўнанні з іншымі краінамі СНД. Так, мы не ўваходзім у Еўрасаюз, таму ў нас троху іншыя ўмовы, і ўсё. Але для тых жа расіян, украінцаў і для нас яны прыкладна аднолькавыя. Іншая рэч – ЗША. Там з пэўных прычын CRDF (Амерыканскі фонд грамадзянскіх даследаванняў і развіцця – дабрачынная арганізацыя, якая спрыяе навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву паміж ЗША і краінамі былога Савецкага Саюза – ***заўв. Рэд.***) не падтрымлівае праекты з навукоўцамі з Беларусі. Але і там розныя падыходы. Навуковая супольнасць SPIE, якая абрала мяне ганаровым членам, базуецца менавіта ў Амерыцы. Дарэчы, сярод 70 новых членаў каля 60 з’яўляюцца амерыканскімі навукоўцамі, а астатнія паходзяць з іншых краін. Да таго ж, я намеснік галоўнага рэдактара навуковага часопіса “Часопіс нанафатонікі”, які таксама выдаецца ў ЗША.

Яшчэ адзін момант: трэба ўмець пісаць праекты. Гэта сапраўды важна. І галоўнае: для таго, каб удзельнічаць у міжнародным супрацоўніцтве, трэба публікавацца ў перадавых міжнародных часопісах з высокім імпакт-фактарам (прысвоеным рэйтынгам). Праз іх аўтары маюць магчымасць атрымаць ролю граюць і перспектыўныя напрамкі. У свеце фінансаванне навуковых даследаванняў зараз у асноўным канцэнтруецца ў медыка-біялагічнай галіне, у галіне фізікі, хіміі і тэхналогіі наноструктур і ў інфармацыйных тэхналогіях. Для Беларусі зараз відавочна дадаўся яшчэ адзін прыярытэт, звязаны з развіццём у краіне ядзернай энергетыкі. Фізфак зараз на ўсю моц працуе ў гэтым кірунку.

ДАВЕДКА

Доктар фізіка-матэматычных навук *Сяргей Максіменка* – аўтар больш за 150 публікацый, сябра Беларускага фізічнага таварыства, Еўрапейскага таварыства матэрыялазнаўцаў (EMRS), Італьянскага фізічнага таварыства, пастаянны ўдзельнік найбуйнейшых міжнародных канферэнцый, член экспертнага савета Міністэрства адукацыі Беларусі па электроніцы і радыётэхніцы, намеснік галоўнага рэдактара міжнароднага часопіса “Journal of Nanophotonics”.

SPIE – Міжнародная супольнасць аптычных інжынераў. Заснавана ў 1955 г. Гэта адна з найбуйнейшых некамерцыйных арганізацый у свеце, якая аб’ядноўвае каля 190 тыс. навукоўцаў амаль са 140 краін свету, якія займаюцца навуковымі даследаваннямі ў оптыцы і фатоніцы, укараненнем такіх новых метадаў праектавання і распрацоўкі тэхналогій, як паўправадніковыя вытворчасці, робататэхніка, медыцынская візуалізацыя, біяметрычная бяспека, апрацоўка выяў, сувязі, астраномія, і многае іншае.

SPIE арганізуе і фінансуе розныя міжнародныя канферэнцыі, выдае навуковую літаратуру, падтрымлівае маладых вучоных.

Ганаровымі членамі SPIE (SPIE Fellows) з дня заснавання супольнасці абраныя больш за 600 вучоных.

Гутарыў Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

АБ'ЯВЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-ВУЧЭБНЫ ЦЭНТР ФІЗІКІ ЧАСЦІЦ І ВЫСОКІХ ЭНЕРГІЙ БДУ (НЦ ФЧВЭ БДУ)

Аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады

- СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі фізікі перспектыўных матэрыялаў.
Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб’явы.
Адрас: г. Мінск, вул. М. Багдановіча,153, каб. 206; тэл. 292-60-34.

РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ ФАКУЛЬТЭТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ

Запрашае на перападрыхтоўку з кастрычніка 2009 г.
выкладчыкаў і спецыялістаў устаноў адукацыі па наступных кірунках:

1. Інфармацыйна-ідэалагічная і выхаваўчая работа ва ўстановах адукацыі 05.10.2009 – 30.04.2010, 1 этап: 05.10 – 24.12 (вочная (па этапах));
2. Псіхалогія 05.10.2009 – 31.03.2011, 1 этап: 05.10 – 31.10, 2 этап: 30.11 – 24.12 (вочная (па этапах));
3. Справавое адміністраванне 05.10.2009 – 29.04.2011, 1 сесія: 05.10 – 31.10 (завочна);
4. Менеджмент установаў прафесійнай адукацыі 26.10.2009 – 19.06.2011, 1 сесія: 26.10 – 20.11 (завочна);
5. Арганізацыя работы з моладдзю 28.09.2009 – 27.11.2010, 1 этап: 28.09 – 23.10, 2 этап: 23.11 – 24.12 (вочная (па этапах)).

Для папярэдняга запісу ў групы тэлефануйце: 222-83-03, 200-20-47.
Наш адрас: 220007 г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, каб 320, тэл./факс 200-25-51.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

On-line канферэнцыя з рэктарам Белдзяржуніверсітэта Сяргеем Абламейкам на тэму “Як паступіць у БДУ?” на сайце БелТА (12.06) – “Советская Белоруссия”, open.by, tut.by, “Минск-новости” (12.06); naviny.by (15.06).

Уручэнне студэнтам і выкладчыкам БДУ пасведчанняў спецыяльнага прэзідэнцкага фонду – “Минск-новости” (17.06); БелТА, БелаПАН (18.06).

Выпускны баль – “Минск-новости” (16.06), БелаПАН (20.06).

Уручэнне дыплома “Ганаровы прафесар БДУ” прэзідэнту Іспанскай Каралеўскай акадэміі эканомікі і фінансаў Хайме Хіль Алуха – “Минск-новости” (15.06).

Арганізацыя цэнтралізаванага тэсціравання ў БДУ – “Рэспубліка”, “Советская Белоруссия”, “Звязда” (16.06).

Залаты медаль ліцэісткі БДУ Анастасіі Чыстай на м/н алімпіядзе па турэцкай мове – БелТА, (11.06); “Минск-новости” (12.06); “Звязда/”Чырвоная змена” (19.06); “Народная газета” (25.06).

Прысуджэнне тытула доктара Інстытута тэалогіі БДУ кардыналу Філіпу Барбарэну – “Звязда” (11.06).

БДУ – удзельнік праекта па стварэнні Сеткавага універсітэта СНД – Интерфакс (11.06); БелТА, tut.by (12.06)

Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

АФІЦЫЙНА

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ У АСПІРАНТУРУ НА 2009 ГОД

З АДРЫВАМ АД ВЫТВОРЧАСЦІ

ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

Механіка-матэматычны факультэт: матэматычны аналіз; дыферэнцыяльныя ўраўненні; вылічальная матэматыка; дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка; механіка дэфармаванага цвёрдага цела.

Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі: тэорыя імавернасці і матэматычная статыстыка; вылічальная матэматыка; матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын, комплексаў і камп'ютарных сетак.

Фізічны факультэт: тэарэтычная фізіка; оптыка; фізіка кандэнсаванага стану; фізіка паўправаднікоў; лазерная фізіка; біяфізіка; фізіка атамнага ядра і элементарных часціц.

Факультэт радыёфізікі і электронікі: сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі; цвёрдацельная электроніка, радыёэлектронныя кампаненты, мікра– і нанаэлектроніка на квантавых эфектах; радыёфізіка.

Хімічны факультэт: хімія цвёрдага цела; неарганічная хімія; фізічная хімія; высокамалекулярныя злучэнні; хімія высокіх энергій.

Біялагічны факультэт: біяхімія; мікрабіялогія; генетыка; батаніка; экалогія; заалогія; фізіялогія і біяхімія раслін; гідрабіялогія; біятэхналогія.

Гістарычны факультэт: айчынная гісторыя; усеагульная гісторыя; гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання; археалогія; этнаграфія, этналогія і антрапалогія; музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў.

Факультэт міжнародных адносін: гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі; сусветная эканоміка; тэорыя мовы; грамадзянскае права; прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае прыватнае права; міжнароднае права; еўрапейскае права; палітычныя інстытуты і працэсы; палітычная канфліктало гія; палітычныя тэхналогіі; тэорыя і гісторыя культуры.

Эканамічны факультэт: эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі.

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук: гісторыя філасофіі; сацыяльная псіхалогія; тэорыя, метадалогія і гісторыя сацыялогіі; сацыялогія кіравання; этыка.

Філалагічны факультэт: тэорыя мовы; руская літаратура; фальклярыстыка; прыкладная і матэматычная лінгвістыка; беларуская мова; літаратура народаў краін замежжа (англійская літаратура).

Факультэт журналістыкі: журналістыка.

Юрыдычны факультэт: тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; гісторыя прававых вучэнняў; грамадзянскі працэс; арбітражны працэс; прыродарэсурснае права, аграрнае права, экалагічнае права; крымінальны працэс, крыміналістыка і судовая экспертыза; аператыўна-вышуковая дзейнасць; адміністрацыйнае права; фінансавае права; інфармацыйнае права; тэорыя палітыкі; гісторыя і метадалогія палітычнай навукі; грамадзянскі працэс; арбітражны працэс; канстытуцыйнае права; муніцыпальнае права.

Геаграфічны факультэт: агульная і рэгіянальная геалогія; фізічная геаграфія і біягеаграфія; геаграфія глебаў і геахімія ландшафтаў; геаэкалогія; картаграфія.

Кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі: агульная педагогіка; гісторыя педагогікі і адукацыі; тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі).

БЕЗ АДРЫВУ АД ВЫТВОРЧАСЦІ

ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

Механіка-матэматычны факультэт: дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка; механіка дэфармаванага цвёрдага цела.

Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі: метады і сістэмы аховы інфармацыі; інфармацыйная бяспека; тэорыя імавернасці і матэматычная статыстыка.

Фізічны факультэт: оптыка; фізіка паўправаднікоў.

Факультэт радыёфізікі і электронікі: інфармацыйна-вымяральныя і кіраўнічыя сістэмы.

Хімічны факультэт: аналітычная хімія.

Біялагічны факультэт: біяхімія; заалогія.

Гістарычны факультэт: айчынная гісторыя; гістарыяграфія; крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

Факультэт міжнародных адносін: гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае прыватнае права; міжнароднае права; еўрапейскае права; сусветная эканоміка; тэорыя мовы; тэорыя і гісторыя культуры.

Эканамічны факультэт: эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі.

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук: сацыяльная філасофія; рэлігіязнаўства, філасофская антрапалогія; філасофія культуры; агульная псіхалогія; псіхалогія асобы; гісторыя псіхалогіі; сацыяльная псіхалогія.

Філалагічны факультэт: беларуская літаратура; тэорыя мовы; літаратура народаў краін замежжа (балгарская літаратура); беларуская мова; руская мова; тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі).

Інстытут журналістыкі: журналістыка.

Юрыдычны факультэт: тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; гісторыя прававых вучэнняў; канстытуцыйнае права; грамадзянскае права; прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае прыватнае права; міжнароднае права; еўрапейскае права; сусветная эканоміка; тэорыя мовы; тэорыя і гісторыя культуры.

Эканамічны факультэт: эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі.

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук: сацыяльная філасофія; рэлігіязнаўства, філасофская антрапалогія; філасофія культуры; агульная псіхалогія; псіхалогія асобы; гісторыя псіхалогіі; сацыяльная псіхалогія.

Філалагічны факультэт: беларуская літаратура; тэорыя мовы; літаратура народаў краін замежжа (балгарская літаратура); беларуская мова; руская мова; тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі).

Інстытут журналістыкі: журналістыка.

Юрыдычны факультэт: тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; гісторыя прававых вучэнняў; канстытуцыйнае права; грамадзянскае права; прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае прыватнае права; міжнароднае права; еўрапейскае права; сусветная эканоміка; тэорыя мовы; тэорыя і гісторыя культуры.

Эканамічны факультэт: эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі.

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук: сацыяльная філасофія; рэлігіязнаўства, філасофская антрапалогія; філасофія культуры; агульная псіхалогія; псіхалогія асобы; гісторыя псіхалогіі; сацыяльная псіхалогія.

Філалагічны факультэт: беларуская літаратура; тэорыя мовы; літаратура народаў краін замежжа (балгарская літаратура); беларуская мова; руская мова; тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі).

Інстытут журналістыкі: журналістыка.

Юрыдычны факультэт: тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; гісторыя прававых вучэнняў; канстытуцыйнае права; грамадзянскае права; прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае прыватнае права; міжнароднае права; еўрапейскае права; сусветная эканоміка; тэорыя мовы; тэорыя і гісторыя культуры.

Эканамічны факультэт: эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі.

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук: гісторыя філасофіі; сацыяльная псіхалогія; тэорыя, метадалогія і гісторыя сацыялогіі; сацыялогія кіравання; этыка.

Філалагічны факультэт: тэорыя мовы; руская літаратура; фальклярыстыка; прыкладная і матэматычная лінгвістыка; беларуская мова; літаратура народаў краін замежжа (англійская літаратура).

Факультэт журналістыкі: журналістыка.

Юрыдычны факультэт: тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; гісторыя прававых вучэнняў; грамадзянскі працэс; арбітражны працэс; прыродарэсурснае права, аграрнае права, экалагічнае права; крымінальны працэс, крыміналістыка і судовая экспертыза; аператыўна-вышуковая дзейнасць; адміністрацыйнае права; фінансавае права; інфармацыйнае права; тэорыя палітыкі; гісторыя і метадалогія палітычнай навукі; грамадзянскі працэс; арбітражны працэс; канстытуцыйнае права; муніцыпальнае права.

Геаграфічны факультэт: агульная і рэгіянальная геалогія; фізічная геаграфія і біягеаграфія; геаграфія глебаў і геахімія ландшафтаў; геаэкалогія; картаграфія.

Кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі: агульная педагогіка; гісторыя педагогікі і адукацыі; тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі).

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

Навучанне вядзецца на аснове дзяржзаказу па заяўках арганізацый, якія маюць патрэбу ў кадрах вышэйшай кваліфікацыі. Аспірант, Заказчык (арганізацыя, якая падала заяўку) і Выканаўца (БДУ) заключаюць кантракт, дзе вызначаюцца абавязкі бакоў. Кантракты заключаюць аспіранты ўсіх формаў навучання.

У аспірантуру з адрывам і без адрыву ад вытворчасці прымаюцца асобы, якія маюць дыплом аб вышэйшай адукацыі (за выключэннем дыплома бакалаўра) і (ці) дыплом магістра, схільнасць да навуковых даследаванняў, што пацвярджаецца навуковымі публікацыямі, дакументамі аб удзеле ў навукова-даследчых і інавацыйных праектах, навукова-практычных канферэнцыях, семінарах і іншымі матэрыяламі. Тыя, хто паступае, павінны мець вопыт практычнай работы не менш за два гады альбо рэкамендацыю Вучонага савета факультэта ВНУ.

У аспірантуру па спецыяльнасцях педагагічнай галіны прымаюцца асобы, якія маюць працоўны стаж па спецыяльнасці ў сферы адукацыі не менш за 2 гады.

Асобы, якія раней прайшлі аспіранцкую падрыхтоўку ў межах вызначанага тэрміну ці поўны курс знаходжання ў якасці суіскальніка вучонай ступені, не маюць права паўторнага навучання ў аспірантуры за кошт бюджэтных сродкаў.

Тыя, хто паступае ў аспірантуру, здаюць уступныя экзамены па спецыяльнасці, замежнай мове і філасофіі ў аб'ёме дзейных праграм для вышэйшых навучальных устаноў. З праграмамі можна азнаёміцца на адпаведных кафедрах. Уступны экзамен па спецыяльнасці папярэднічае экзаменам па іншых дысцыплінах. Пераздача ўступных экзаменаў не дапускаецца.

Ацэнка ведаў тых, хто паступае, ажыццяўляецца па дзесяцібальнай шкале.

Асобы, якія здалі цалкам ці часткова кандыдацкія экзамены згодна з вызначанымі патрабаваннямі, вызваляюцца ад адпаведных уступных экзаменаў і карыстаюцца пераважным правам залічэння ў аспірантуру па конкурсе. Здача ўступнага экзамену па спецыяльнасці пры прыёме ў аспірантуру абавязковая.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру, падаюць на імя рэктара універсітэта заяву вызначанага ўзору і дадаюць наступныя дакументы:

– асабісты лісток па ўліку кадраў з наклееным фотаздымкам;

– аўтабіяграфію;

– медыцынскую даведку па форме, вызначанай Міністэрствам аховы здароўя для тых, хто паступае ў ВНУ;

– ксеракопіі дыплома аб вышэйшай адукацыі і выпіскі з заліковай ведамасці;

– ксеракопіі дыплома магістра і дадатку да дыплома магістра (пры наяўнасці);

– пасведчанне аб здачы кандыдацкіх экзаменаў і заліку (пры наяўнасці ў тых, хто паступае ў аспірантуру, здадзеных кандыдацкіх экзаменаў);

– ксеракопію працоўнай кніжкі (для тых, хто працуе);

– ксеракопію пашпарта (стар.1, 31, 32, 33 і старонка з прапіскай);

– рэкамендацыю Савета факультэта ВНУ. Рэкамендацыя выдаецца ў год выпуску і дзейнічае на працягу 2-х гадоў. У рэкамендацыі Вучонага савета факультэта ВНУ павінна ўказвацца тэма дыпломнай работы ці магістэрскай дысертацыі, а таксама адлюстроўвацца ўдзел рэкамендаванага ў навукова-практычных канферэнцыях, семінарах, наяўнасць у яго публікацый (артыкулаў, дакладаў), патэнтаў на вынаходствы, грантаў, імянных стыпендый;

– спіс і копіі апублікаваных навуковых прац, вынаходстваў і распрацовак, патэнтаў і спіс справаздач аб выкананых даследаваннях і распрацоўках; асобы, якія не маюць апублікаваных навуковых прац, вынаходстваў і патэнтаў, прадстаўляюць навуковыя даклады (рэфераты) па абранай тэме ў адпаведнасці са спецыяльнасцю. Навуковыя працы ці рэферат рэцэнзуюцца меркаваным навуковым кіраўніком. Рэцэнзія пішацца на адваротным баку экзаменацыйнага ліста. Паводле рэферата выстаўляецца ацэнка па дзесяцібальнай сістэме;

– пратакол вынікаў сумоўя з намеснікам дэкана па навуковай рабоце, загадчыкам кафедры і меркаваным навуковым кіраўніком;

– 2 фотаздымкі;

– два канверты са зваротным адрасам таго, хто паступае ў аспірантуру;

– хуткасшывальнік (кардонны, аднатонны).

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру па накіраваннях арганізацый, прадстаўляюць дадаткова накіраванні арганізацый.

Пашпарт, арыгіналы дыплома аб заканчэнні ВНУ і дакументаў аб здачы кандыдацкіх экзаменаў прад'яўляюцца асабіста.

Прыём у аспірантуру з 1 ліпеня па 15 верасня 2009 года.

Уступныя экзамены праводзяцца з 25 верасня па 17 кастрычніка 2009 г.

Залічэнне ў аспірантуру з 2 лістапада.

Усім, хто паступае ў аспірантуру, перад першым уступным экзаменам па спецыяльнасці неабходна забраць у аддзеле аспірантуры экзаменацыйны ліст з пратаколам і пасля экзамену ў гэты ж дзень вярнуць іх у аддзел аспірантуры.

На наступныя экзамены (па замежнай мове і філасофіі) экзаменацыйныя лісты будуць накіроўвацца цэнтралізавана.

Усе, хто паступае ў аспірантуру, да 10 верасня павінны прайсці сумоўе з намеснікам дэкана па навуковай рабоце, загадчыкамі кафедраў і меркаванымі навуковымі кіраўнікамі.

Асобам, дапушчаным да здачы ўступных экзаменаў у аспірантуру, паводле іх заявы наймальнік абавязаны даць адпачынак без захавання заработнай платы для падрыхтоўкі і здачы ўступных экзаменаў.

Паводле вынікаў уступных экзаменаў прыёмная камісія прымае рашэнне аб залічэнні ў аспірантуру асоб, якія паспяхова іх здалі.

Пры аднолькавай суме балаў па выніках здачы ўступных экзаменаў пераважным правам залічэння ў аспірантуру карыстаюцца асобы, якія атрымалі больш высокую адзнаку па спецыяльнай дысцыпліне.

Пераважным правам залічэння ў аспірантуру карыстаюцца:

– асобы, якія здалі часткова ці цалкам кандыдацкія экзамены па агульнаадукацыйных дысцыплінах;

– асобы, якія маюць вопыт практычнай работы не менш за два гады па профілі, адпаведным той навуковай галіне (групе спецыяльнасцяў), па якой ажыццяўляецца залічэнне ў аспірантуру;

– асобы, якія паступаюць у аспірантуру па заяўках іншых арганізацый;

– асобы, якія з'яўляюцца лаўрэатамі Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь ці іншых рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў навуковых прац;

– асобы, якія з'яўляюцца лаўрэатамі спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і атрымалі ўказаныя званні падчас навучання ў ВНУ.

Аспірантам, якія навучаюцца з адрывам ад вытворчасці на бюджэтнай аснове, у вызначаным парадку выплачваецца стыпендыя.

Тэрмін навучання ў аспірантуры з адрывам ад вытворчасці – 3 гады, без адрыву ад вытворчасці – 4 гады.

Іншагароднім прадстаўляецца інтэрнат (без сям'і).

Гэтую інфармацыю супрацоўнікі і студэнты БДУ могуць атрымаць на сайце *www.bsu.by*, а таксама праз любую праграму, якая працуе з электроннай поштай (напрыклад, Microsoft Outlook). Для гэтага неабходна ў меню Від-Спіс папак адкрыць Агульныя папкі – Усе агульныя папкі – Галоўнае ўпраўленне навукі – Аддзел аспірантуры.

Дакументы падаваць на адрас: г.Мінск, вул. Бабруйская, 9, аддзел аспірантуры БДУ, каб. 419;

тэл. 209-54-23, 209-51-73.

Перад падачай дакументаў у аддзел аспірантуры БДУ тым, хто паступае, неабходна зарэгістравацца. Рэгістрацыя здзяйсняецца праз сайт БДУ *www.bsu.by*. Для рэгістрацыі неабходна выканаць наступныя дзеянні:

1. На галоўнай старонцы сайта БДУ ўвайсці ў раздзел "Навука";

2. Затым у падраздзел "Аспірантура";

3. У раздзеле "Аспірантура" неабходна выбраць укладку "Рэгістрацыйная форма" і запоўніць палі.

Запаўненне ўсіх палёў з'яўляецца абавязковым. Выключэнне складаюць чатыры палі, якія характарызуюць вучобу ў магістратуры (для асоб, якія не скончылі магістратуру). У полі "Стыпендыят" неабходна рабіць выбар "Так", калі Вы атрымлівалі ўзнагароды спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў падчас вучобы ў ВНУ.

У 2009 Г. У ДАКТАРАНТУРУ БДУ ЗДЗЯЙСНЯЕЦЦА ПРЫЁМ ПА НАСТУПНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

Механіка-матэматычны факультэт	
01.01.01	*Матэматычны аналіз*
Фізічны факультэт	
01.04.10	*Фізіка паўправаднікоў*
Біялагічны факультэт	
03.00.08	*Заалогія*
Філалагічны факультэт	
10.01.01	*Беларуская літаратура*
10.01.09	*Фальклярыстыка*
Факультэт філасофіі і сацыяльных навук	
19.00.05	*Сацыяльная псіхалогія*

Навучанне ў дактарантуры ажыццяўляецца па вочнай форме. Тэрмін навучання ў дактарантуры тры гады.

У дактарантуру прымаюцца асобы з навуковай ступенню кандыдата навук, якія маюць навуковыя працы (артыкулы, манаграфіі, вынаходствы, патэнты і іншыя матэрыялы, што пацвярджаюць уклад у навуку), якія складаюць у сукупнасці аснову для доктарскай дысертацыі з магчымасцю яе завяршэння на працягу трох гадоў.

Асобы, якія раней прайшлі падрыхтоўку ў дактарантуры за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту ў межах вызначанага тэрміну або поўны курс навучання ў форме суіскальніцтва для атрымання навуковай ступені доктара навук, права паўторнага паступлення ў дактарантуру за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту не маюць.

Асобы, якія паступаюць у дактарантуру, падаюць на імя кіраўніка арганізацыі, пры якой створана дактарантура, заяву і дадаюць наступныя дакументы:

– асабісты лісток па ўліку кадраў;

– аўтабіяграфію;

– медыцынскую даведку па форме, вызначанай Міністэрствам аховы здароўя для тых, хто паступае ў ВНУ;

– дзве фатаграфіі памерам 4х6 см;

– копію дыплома кандыдата навук;

– копію працоўнай кніжкі;

– спіс і копіі апублікаваных навуковых прац;

– план падрыхтоўкі доктарскай дысертацыі, разлічаны на завяршэнне працы на працягу трох гадоў;

– водгукі двух дактароў навук, кірункі даследаванняў якіх блізкія да тэмы дысертацыі, з ацэнкай актуальнасці і навуковай абгрунтаванасці тэмы і прапанаванага плана падрыхтоўкі дысертацыі і ўказаннем магчымасці яго выканання за тры гады.

Пашпарт і арыгінал дыплома кандыдата навук прад'яўляюцца асабіста.

Навучанне вядзецца на аснове дзяржзаказу, па заяўках арганізацый, якія маюць патрэбу ў кадрах вышэйшай кваліфікацыі. Дактарант, Заказчык (арганізацыя, якая падала заяўку) і Выканаўца (БДУ) заключаюць кантракт, у якім вызначаюцца абавязкі бакоў.

Дактарантам, якія навучаюцца на бюджэтнай аснове, у вызначаным парадку выплачваецца стыпендыя.

МАНІТОРЫНГ

КУРЫВА ЦІ ЗДАРОЎЁ – НЕ МІФІЧНАЯ, А ЖЫЦЦЁВАЯ ДЫЛЕМА

З 15 да 31 мая у нашай краіне праходзіла рэспубліканская акцыя "Беларусь супраць тытуню", прымеркаваная да Сусветнага дня без тытуню, які традыцыйна адзначаецца напрыканцы мая. Кансультаванні, тэлефоны даверу, "круглыя сталы" і прэс-канферэнцыі – грамадзянам была даступная любая інфармацыя. Мы таксама прапануем вашай увазе падборку матэрыялаў па дадзенай праблематыцы.

На жаль, сёння Беларусь уваходзіць у лік 10 самых злосных курцоў Еўропы. Па розных статыстычных дадзеных, у Беларусі паляць ад 50% да 65% мужчын і ад 16% да 20% жанчын. Штогод у краіне ад хвароб, прычына якіх – курэнне, паміраюць 15,5 тыс. жыхароў. А самы высокі працэнт курцоў (43,1%) адзначаны ва ўзроставай групе ад 16 да 29 гадоў. Дарэчы, ва ўсім свеце тытунь забівае да 5 млн. чалавек.

Паводле айчыннага заканадаўства, на дадзены момант у нашай краіне месцамі забаронены курэння (за выключэннем месцаў, прызначаных для гэтай мэты) з'яўляюцца:

– установы аховы здароўя, культуры, адукацыі, спорту, аб'екты гандлю і побытавага абслугоўвання;

– памяшканні органаў дзяржкіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў;

– вакзалы, аэрапорты, падземныя пераходы, станцыі метрапалітэна;

– грамадскі транспарт, вагоны цягнікоў, суды, самалёты, за выключэннем цягнікоў далёкага накіравання, судоў і самалётаў, дзе прадугледжаны месцы для курэння.

Штраф за парушэнне правіл заканадаўства складае ад 0,1 да 0,5 базавай велічыні.

ШКОДА І НАСТУПСТВЫ

Па звестках урача, загадчыцы Кардыялагічнага цэнтра Першамайскага раёна г. Мінска *Наталлі Дарашэвіч*, курэнне звязана з больш чым 25 небяспечнымі захворваннямі (сардэчна-сасудзістыя захворванні, захворванні органаў дыхання, СКГ, касцявой сістэмы, вачэй, скуры, анкалагічныя захворванні розных сістэм арганізма). У цыгарэтным дыме знайшлі каля 3 тыс. шкодных рэчываў, з іх 43 выклікаюць рак.

Курэнне пры доўгатэрміновым уздзеянні шкодзіць сэрцу, сістэме кровазвароту, выклікае перадусім інфаркт міякарда і атэрасклероз. Яно нашмат павялічвае рызыку розных ракавых захворванняў, у прыватнасці, гартані і лёгкіх, можа выклікаць язву дванаццаціперснай кішкі і хранічны бранхіт. Самае страшнае ў гэтых цяжкіх хваробах тое, што яны звычайна развіваюцца цягам доўгага часу і толькі паступова выяўляецца іх сапраўдны маштаб. Згубны ўплыў нікаціну на палавыя залозы выяўляецца ў мужчын у развіцці палавой слабасці – імпатэнцыі.

Аміяк пры згаранні тытуню трапляе ў трахею, бронхі, лёгкія. У вільготным слізістым асяроддзі ён растваряецца і ператвараецца ў нашатырны спірт, які раздражняе слізістыя абалонкі, выклікае кашаль, хранічны бранхіт, алергічныя захворванні. У сваю чаргу, бранхіт дае непрыемны пах з рота. У выніку хранічнага запалення бронхі пашыраюцца, утвараюцца бронхаэктазы з цяжкімі наступствамі – пнеўмасклерозам, эмфіземай лёгкіх, што прыводзіць да недастатковасці кровазвароту. Гэта і вызначае вонкавы выгляд заўзятага курца: ахрыплы голас, азызлы твар, задышка.

Значная роля курэння і ва ўзнікненні сухотаў (туберкулёзу). Так, 95 са 100 хворых на момант пачатку захворвання курылі.

Курэнне можа стаць і галоўнай прычынай стойкай спазмы сасудаў ног, што вядзе да развіцця аблітэруючага эндартэрыіту, на які хварэюць пераважна мужчыны. Гэтае захворванне прыводзіць да парушэння сілкавання ног, гангрэны і ў выніку да ампутацыі.

Ад рэчываў у тытунёвым дыме пакутуюць таксама страўнік, зубы і слізістая абалонка рота. Нікацін павялічвае сакрэцыю страўнікавага соку, што выклікае ныючы боль пад дыхавіцай, млоснасць, ваніты.

Гэтыя сімптомы могуць быць і праявай гастрыту, язвавай хваробы страўніка, якія ў курцоў бываюць нашмат часцей.

Курэнне можа выклікаць нікацінавую амбліяпію. У такіх хворых узнікае частковая або поўная слепата, і нават інтэнсіўнае лячэнне не заўсёды прыносіць плён.

Антытытунёвая акцыя ў Чылі. Надпіс на лістоўцы: "Здаецца, вам патрэбна не толькі цыгарэта, але і дапамога".

Курэнне бацькоў адмоўна адбіваецца на дзецях, у якіх часцей бываюць бранхіты, пнеўманіі. Такія дзеці адстаюць у развіцці, дрэнна вучацца ў школе. У цяжарных курцоўжанчын бываюць выкідышы або дзеці нараджаюцца дачасна, з малой вагой. Гэта, так бы мовіць, "тытунёвы сіндром плода" (па аналогіі з пасіўным курэннем плода). Немаўляты прыходзяць на свет з несумяшчальнымі з жыццём хваробамі ў 2-3 разы часцей. Гэта прыводзіць да незваротнай бяды ў 30-50% выпадкаў. Такое пасіўнае курэнне, натуральна, шкодзіць і навакольным дарослым.

Увогуле, лічыцца, што курэнне скарачае жыццё на 5-7 гадоў.

Шкодна курыць не толькі цыгарэты, але і разнастайныя псіхаактыўныя рэчывы. Так, у Фінляндыі група навукоўцаў правяла даследаванне, у ходзе якога выявілася, што паміж ужываннем у юнацкасці марыхуаны і павышэннем рызыкі псіхічных захворванняў ёсць прамая залежнасць. Навукоўцы выявілі ў падвопытных падлеткаў, якія ўжываюць марыхуану, прынамсі тры сімптомы ўзнікнення псіхозу. Сярод іншага ў юных курцоў лёгкага наркотыку ўзнікае страта адчування рэальнасці, паслабленне волі і затарможанасць у думках.

ЯК КІНУЦЬ? ЖЫЦЦЁВЫЯ ПАРАДЫ

Каб адмовіцца ад курэння, у вас павінна з'явіцца матывацыя для гэтага кроку. Калі няма выразнай рашучасці вызваліцца ад тытунёвай залежнасці, значыць, вы проста не лічыце курэнне праблемай.

Каб пазбавіцца дрэннай прывычкі, зрабіце наступнае. Вазьміце чысты аркуш паперы. Падзяліце яго на дзве паловы, уверсе на адной напішыце "Што дае мне курэнне", на другой – "Чаму я хачу пазбавіцца курэння". Затым сумленна пералічыце ўсе прычыны па пунктах. Пасля параўнайце абодва спісы. Калі аргументаў другога спіса больш і гучаць яны больш важка, значыць, у вас сапраўды ёсць прычыны пазбавіцца цыгарэт. Калі колькасць аргументаў у першым спісе дамінуе, значыць, праблемы з курэннем вы не бачыце. Тады кінуць будзе цяжка. Калі "выйграў бітву" другі спіс, заўсёды насіце яго з сабой. І калі вам зноў захочацца запаліць, дастаньце яго і перачытайце.

Таксама пазбаўцеся ўсіх "хованак" у сумках і кішэнях, выкіньце запальнічкі і запалкі, прыбярыце з вачэй попельніцы і іншыя аксесуары курэння.

Сёння існуе даволі шмат літаратуры пра тое, як кінуць паліць. Але самай лепшай сярод курцоў прызнана кніга Алена Кара "Лёгкі спосаб кінуць паліць". "Я прачытаў кнігу і зараз нават не хачу паліць. І гэта пасля 9 гадоў курэння! Я шчаслівы! Эфектыўнасць кнігі – 90 чалавек са 100", – падзяліўся адзін з чытачоў Алена Кара.

СІТУАЦЫЯ Ў ЗАМЕЖЖЫ БЛІЗКІМ І ДАЛЁКІМ

Расія:

У Анапе з педагогамі павінны праводзіцца заняткі на тэму шкоды курэння, а таксама негатыўнага ўплыву тытунёвага дыму на дзіцячы арганізм. Калі ж будзе выяўлены факт курэння выкладчыка, на яго будзе накладацца грашовы штраф.

Украіна:

Кіеўская гарадская рада вызначыла пералік месцаў, у якіх забаронена курэнне. Сярод іх апынуліся дзіцячыя пляцоўкі, кампутарныя клубы, кінатэатры і прылеглая да іх тэрыторыя, прыпынкі грамадскага транспарту, ліфты і пад'езды, установы адукацыі, аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту і інш. А ў офісных памяшканнях, установах гандлю, крамах, аб'ектах грамадскага харчавання, начных клубах і дыскатэках абавязкова павінны быць спецыяльныя месцы для курэння, абсталяваныя вентыляцыяй.

Латвія:

Пачкі цыгарэт ілюструюць каляровымі малюнкамі, якія распавядаюць пра шкоду курэння. Да іх таксама дадаюцца каляровыя фатаграфіі з малюнкам пашкоджаных тытунем лёгкіх і іншых частак цела. Акрамя надпісаў пра шкоду курэння, ёсць і заклікі кінуць згубную звычку.

Літва:

Сёлета ў Літве чакаецца рэкорднае (да 60%) падаражанне цыгарэт. Да восені пасля двух этапаў падаражання пачак папулярных цыгарэт будзе каштаваць больш за 2 еўра.

Кыргызстан:

У Жагорку Кенэшэ (парламенце Кыргызстана) прайшлі слуханні па праекце Падатковага Кодэкса, паводле якога акцызы на тытунь павялічваюцца на 30%.

Германія: зона для паленя строга абмежавана

Германія:

У аэрапорце Франкфурта забаронена курэнне. А ўсе курыльныя адсекі ў тэрміналах аэрапорта ліквідаваны.

ЗША:

Ва універсітэце штата Індыяна было праведзена даследаванне, якое выявіла, што пасля забароны курэння на тэрыторыі адной акругі ўзровень шпіталізацый людзей з сардэчнымі прыступамі панізіўся на 70%. Адначасова пацвердзіўся тэзіс, што паленне больш шкодзіць навакольным людзям, чым самім курцам.

***

У Каліфорніі ўведзена забарона на курэнне ў аўтамабілі, калі ў ім знаходзяцца непаўналетнія. Акрамя таго, нельга паліць бліз дзіцячых пляцовак, у грамадскіх установах, барах, клубах і рэстаранах, на пляжах і ў парках. Каліфорнія стала трэцім штатам, дзе забаранілі курэнне ў аўтамабілі ў прысутнасці непаўналетніх. У Арканзасе нельга паліць у машыне, калі побач знаходзяцца дзеці да 6 гадоў, у Луізіяне – калі ў салоне знаходзяцца асобы, што не дасягнулі 13 гадоў.

Брытанія:

Брытанцы харчуюцца не дома часцей, а курцы паляць менш, пасля ўвядзення забароны курэння. Пра гэта сведчаць вынікі апытання пра ўздзеянне забароны курэння ў грамадскіх месцах на ўсёй тэрыторыі Вялікабрытаніі. Падчас тэлефоннага апытання прапанавалася адказаць: "Якім чынам забарона курэння закранула вашы звычкі?". Большасць (84%) некурцоў адказалі, што зараз прыём ежы ў грамадскіх месцах стаў больш прыемным і таму пазітыўным.

Японія:

Даследаванне, праведзенае ў Японіі, паказала, што дзеці, матулі якіх палілі нават на ранніх стадыях цяжарнасці, амаль у тры разы з большай верагоднасцю будуць пакутаваць ад залішняй вагі. Хаця дакладная прычына гэтага невядомая, адна з гіпотэз заключаецца ў тым, што дзеці, чые маці паляць, атрымліваюць недастаткова сілкавання ў чэраве. Вынікі даследавання паказваюць, што курэнне на працягу цяжарнасці можа адгукнуцца на здароўі дзяцей нават праз працяглы перыяд часу.

Ніўэ:

Урад маленькай дзяржавы на выспе Ніўэ ў паўднёвай частцы Ціхага акіяна будзе плаціць курцам за адмову ад цыгарэт.

КІНО І ЦЫГАРЭТЫ

Цыгарэта ў руках прыгожай і элегантнай жанчыны ці моцнага і ўладнага мужчыны выглядае даволі гарманічна. Так, прыгадаем, напрыклад, некаторыя з фільмаў: "Кава і цыгарэты" (Coffee and Cigarettes, 2003), "Дабранач і поспехаў" (Good Night, and Good Luck, 2005), "Агні гарадской ускраіны" (Laitakaupungin valot, 2006), "Тут паляць" (Thank You for Smoking, 2005). Ва ўсіх гэтых фільмах цыгарэты добра ўпісваюцца ў вобразы галоўных герояў, яны становяцца іх своеасаблівай візітоўкай. Так, прыгожыя малюнкі, але... ці варта суадносіць фільмы з рэальным жыццём?

Падрыхтавала
Марына САВІЦКАЯ

УНІВЕРСІТЭТ

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

Напэўна, многія студэнты БДУ бачылі на інфармацыйных стэндах афішы з тэкстам: "Не заставайся абыякавым!", "Набіраюцца валанцёрскія атрады для працы ў дзіцячым доме!". Хтосьці са студэнтаў прынамсі патэлефанаў па ўказаным на афішы нумары. А некаторыя нават далучыліся да праекта "Мая школа". І, што асабліва прыемна, такіх студэнтаў шмат!

"Мая школа": сёння і заўтра

Вынікам работы праекта і перспектывам яго развіцця і быў прысвечаны круглы стол "Праект «Мая школа»: сёння і заўтра", які адбыўся 5 чэрвеня 2009 г. на юрыдычным факультэце БДУ. На круглы стол былі запрошаныя прадстаўнікі адміністрацыі універсітэта, дэканы факультэтаў, якія актыўна бралі ўдзел у праекце, студэнты, якія ўклалі шмат сіл у працу валанцёрскіх атрадаў. Прыемна, што мерапрыемства не засталося па-за ўвагай гарадскіх улад, на сустрэчы прысутнічала намеснік старшыні Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Таццяна Злобіна.

У цёплай сяброўскай атмасферы студэнты дзяліліся ўражаннямі пра сваю працу, узгадвалі самыя яркія моманты.

А распавядаць было пра што! Бо ўжо тры гады дзейнічае сумесны праект Студэнцкага Саюза БДУ і Студэнцкага Савета па якасці адукацыі. Пачынаўся ён у СШ № 161 г. Мінска. Да праекта далучыўся ў наступным навучальным годзе восьмы дзіцячы дом, а ў канцы навучальнага года і дзіцячы дом № 6. Практычна штодня групы студэнтаў вядуць заняткі па розных дысцыплінах школьнага курса. Студэнты рыхтуюць з дзецьмі хатнія заданні, тлумачаць новыя тэмы, дапамагаюць у запаўненні ранейшых "прабелаў".

Але проста вучыць дзяцей, напэўна, студэнтам здалося мала. Ды і як тут застанешся ўбаку, калі дзеці просяць студэнтаў з імі пагуляць і пагутарыць? Вось і было вырашана ўвесці ў праект новыя формы працы з выхаванцамі з дзіцячых дамоў. Былі ўтвораны "Валанцёрскія групы выхаднога дня". Асноўнай дзейнасцю гэтых груп з'яўляецца арганізацыя вольнага ад вучобы часу школьнікаў. На юрыдычным факультэце БДУ была праведзеная акцыя па зборы канцтавараў і вопраткі для дзяцей з дзіцячых дамоў. У дзіцячым доме № 6 была арганізаваная акцыя сумесна з кампаніяй "Анега". У якасці падарункаў да Новага года дзякуючы фундатарскай падтрымцы дзіцячы дом атрымаў наборы развіццёвых гульняў, глобусы і яркія цацкі.

Працытуем студэнтаў, якія прымалі ўдзел у круглым стале:

"Для мяне праект – гэта школа, у якой я імкнуся стварыць атмасферу сяброўства, разумення, дапамогі дзецям" (Гайдук Кацярына).

"Самая вялікая падзяка – гэта шчаслівыя вочы дзяцей" (Дубалека Іна).

"Я шчаслівая, што ў мяне ёсць магчымасць дапамагчы!" (Глаз Ганна).

Ад сябе мне застаецца толькі дадаць, што праект "Мая школа" – гэта каманда добрых, спагадных і шчырых людзей, якімі могуць ганарыцца іх родныя, сябры, універсітэт!

Святлана ГРЫГЕЛІС,
кіраўнік праекта "Мая школа"

У ВОЛЬНЫ ЧАС

БРЫГАНЦІНА – ДЗІЦЯЧЫ КРАЙ

Вось ужо каторае лета запар спартыўна-аздараўленчы комплекс БДУ "Брыганціна" гасцінна прымае тых, хто хоча добра адпачыць, а таксама цікава і з карысцю для сябе правесці летнія канікулы.

Дзіцячы адпачынак у "Брыганціне" традыцыйна ўключае ў сябе тры змены па 18 дзён, а ўзроставы дыяпазон – ад шасці да васемнаццаці гадоў.

Супрацоўнікі "Брыганціны" добра разумеюць, што дзеці – гэта наша будучыня, і таму імкнуцца да ўсебаковага развіцця кожнага са сваіх падапечных.

Раскрыць творчыя таленты дзеці могуць праз мастацкую самадзейнасць. Сапраўднае свята для ўсіх – бацькоўскі дзень, які па традыцыі адкрываецца ўрачыстым канцэртам, падрыхтаваным дзецьмі і іх педагогамі-выхавальнікамі. Сярод апошніх, напрыклад, кожнае лета можна сустрэць папулярнага і так любімага дзецьмі спевака і тэлевядучага Георгія Калдуна (які, дарэчы, з'яўляецца выпускніком БДУ) і тэлерадыёвядучага Паўла Шастакова. Таму сцэнічнаму майстэрству дзеці могуць павучыцца ў сапраўдных прафесіяналаў.

Адзін з прыярытэтных напрамкаў – спартыўныя мерапрыемствы. На працягу ўсёй змены дзеці актыўна практыкуюцца ў такіх відах спорту, як бег, настольны тэніс, стрытбол, футбол, піянербол, плаванне, дартс, шашкі, шахматы і інш. "Вельмі прыемна, – адзначае дырэктар комплексу Уладзімір Палякоў, – што ў нашым лагеры адпачывае і выхоўваецца шмат вельмі развітых дзетак, якія, дарэчы, сёлета чарговы раз сталі пераможцамі Міжлагернай спартакіяды Маскоўскага раёна". І ў гэтым ён бачыць вялікую заслугу інструктараў па фізкультуры Віталя Маргунова, Аляксандра Сухарукава, Святланы Скурат і Жанны Залеўскай.

На гэты раз ва ўрачыстым закрыцці "малых алімпійскіх гульняў" і цырымоніі ўзнагароджання прызёраў прыняў удзел адказны па міжнародных сувязях італьянскага нацыянальнага спартыўнага таварыства "Libertas", член калегіі НАК Італіі па органах спартыўнай юстыцыі адвакат Рафаэле Галус, які з задавальненнем перадаў пераможцам і ўдзельнікам спаборніцтваў прызы і медалі ад "Libertas". Ці варта казаць пра ажыятаж сярод маленькіх спартоўцаў, які выклікала гэта падзея? І нікога не абмінулі ўвагай! Адмысловы кубак за прапаганду здаровага ладу жыцця, папулярызацыю спорту сярод моладзі быў уручаны адміністрацыі САК "Брыганціна". У сваёй прамове Рафаэле Галус высока ацаніў працу, скіраваную на спартыўна-мастацкае, асобаснае развіццё дзяцей і фарміраванне агульначалавечых духоўных каштоўнасцяў.

Але самае важнае і аб'ектыўнае меркаванне саміх дзяцей, якія ў адзін голас вам скажуць: "«Брыганціна» – самае лепшае месца ў свеце!".

Анжаліка САДОЎСКАЯ,
дацэнт філалагічнага факультэта

ТВОРЧАЯ ПЛЯЦОЎКА

Першы год плёнам

Пакуль усе збіраюцца на вакацыі – адпачыць ад праміналага навучальнага года і бурнай прыёмнай кампаніі, у тэлецэнтры БДУ поўным ходам ідуць кастынгі, запісы праграм, планаванне і запуск праектаў. Працу, праведзеную ад часу першага выхаду ў эфір (12 кастрычніка 2008 г.), аглядае дырэктар установы Аляксандр ПАРФЯНЦОЎ.

Ігар Угольнікаў падчас перадачы ў павільёне тэлецэнтра БДУ

РАСКАЗВАЛІ, ПАКАЗВАЛІ, ДАЛІ ПАСПРАБАВАЦЬ

У тэлецэнтра два асноўныя клопаты – тэхнічнае забеспячэнне вучэбна-вытворчага працэсу і здабыванне грошай для далейшай дзейнасці. Сумяшчаць падрыхтоўку студэнтаў Інстытута журналістыкі з ажыццяўленнем камерцыйных праектаў няпроста, але прадуктыўна. Учорашнія абітурыенты трапляюць у рукі прафесіяналаў, праходзяць першасную падрыхтоўку, а затым, далучыўшыся да выпуску рэальнага тэлевізійнага прадукту, удасканальваюць навыкі пад наглядам усё тых жа дасведчаных майстроў.

У другім семестры 2008/2009 н.г. будучыя "аўдыёвізуальшчыкі" выпускалі вучэбныя перадачы, авалодвалі публіцыстычнымі жанрамі і формамі тэлежурналістыкі, засвойвалі тэхніку тэлебачання і радыёвяшчання, тэлевытворчасць, тэхніку эфірнага маўлення, методыку радыё- і тэлежурналістыкі ды іншыя дысцыпліны, курсы па профілі – усяго з лютага па май 2009 г. у тэлецэнтры прайшло больш за 300 гадзін вучэбных заняткаў. Пра сакрэты абранай прафесіі даведваліся падчас творчых сустрэч з вядучымі супрацоўнікамі тэлебачання і кіно, якія рэгулярна ладзіла на базе тэлецэнтра кафедра тэлебачання і радыёвяшчання Інстытута журналістыкі. Да таго, пяцікурснікі знайшлі тут тэхнічную дапамогу падчас выканання дыпломных праектаў. Так, адна студэнтка ў якасці дыпломнай працы стварыла фільм па курсе "Крымінальны кодэкс" на замову юрфака, аналагічныя стужкі былі зробленыя і для ваеннага факультэта БДУ.

Выйсцем з патавай сітуацыі, калі трэба і студэнтаў трэніраваць, і дарагую тэхніку ў працоўным стане захоўваць, стаў дадатковы вучэбна-вытворчы павільён, абсталяваны за кошт прыбыткаў ад пазабюджэтнай дзейнасці тэлецэнтра (з верасня 2008 г. па красавік 2009 г. прыбытак склаў каля 222 млн. руб.; аднак гэтая сума не пакрывае выдаткаў на падтрыманне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы, таму даводзіцца і далей шукаць заказчыкаў і ствараць камерцыйна выгадную відэа- і аўдыёпрадукцыю). Калі гадзіна працы апаратна-студыйнага комплексу тэлецэнтра каштуе каля 700 тысяч рублёў, гадзіна працы вучэбнай студыі абыходзіцца ў дзесяткі разоў танней, пры гэтым студэнты маюць права на памылкі і збіванне наладак камер. Такім чынам, малодшыя курсы вучацца націскаць правільныя кнопкі ў адмысловым павільёне, а ў асноўным старшакурснікі бяруць удзел у вырабе эфірных праграм.

Навучанне вялося, дый вядзецца, і праз падрыхтоўку праграмы "Час Саюза" Тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі саюзнай дзяржавы: сюжэты да кожнай праграмы рыхтуюць чатыры творчыя групы студэнтаў Інстытута журналістыкі, створаныя на кафедры тэлебачання і радыёвяшчання. Другакурсніца Яна Кунда, атрымаўшы рэкамендацыю ад тэлецэнтра, стала рэдактарам праграмы – і ёю, дарэчы, вельмі задаволеныя.

Падобнае навучанне практыкай будзе пашырацца – для гэтага распрацоўваецца адразу некалькі цікавых праектаў.

ВАРТЫ? ПІШЫ СЦЭНПЛАН!

У стадыі перамоў з Белтэлерадыёкампаніяй, Другім нацыянальным каналам і Сталічным тэлебачаннем знаходзіцца праект "Студэнцкія навіны". Праграма плануе асвятляць падзеі з жыцця універсітэцкай супольнасці, апавядаць пра дасягненні студэнтаў у адукацыйнай, навукова-даследчай галіне, спорце, творчасці, удзел у сацыяльных і культурных імпрэзах. А рабіць яе будуць студэнты галоўных ВНУ краіны – БДУ, БДУІР, БДАМ і, надалей, усе ахвотныя. Вытворчасць праграмы паслужыць добрай практыкай для наступнай працы на тэлебачанні, але патрапяць у гэтую школу прафесійнага майстэрства толькі самыя вартыя. Каб іх знайсці, адбор у тэлецэнтры арганізавалі ў тры этапы.

Першы прадугледжваў запаўненне анкеты, фота- і відэасесію прэтэндэнтаў і сумоўе. У базу дадзеных тэлецэнтра трапілі амаль 150 амбітных маладзёнаў – менавіта да іх звернуцца, калі будуць патрэбныя кадры для новых праектаў. Тыя ж, каго палічылі прыдатнымі акурат для "Студэнцкіх навін", атрымалі пісьмовыя заданні, якія мусілі дапамагчы выявіць узровень пісьменнасці кандыдатаў, здольнасці засвойваць і апрацоўваць інфармацыю ў экстрэмальных умовах – пры адсутнасці часу, што ёсць звыклай практыкай тэлевізійшчыкаў. Напярэдадні выпрабавання студэнтам давалася заданне – допускам да другога этапа быў складзены за вечар сцэнплан, пацверджанне таго, што яго аўтар здольны працаваць хутка. Затым за адведзены невялікі прамежак часу трэба было выдаць яркія тэмы для навін, захапляльныя падводкі да сюжэтаў, прадумаць магчымыя крыніцы інфармацыі і г.д. Па якасці здадзеных матэрыялаў будуць вызначаны ўдзельнікі трэцяга этапа – для іх Аляксандр Парфянцоў з хітрай усмешкай абяцае прыдумаць "штосьці вясёлае". Натуральна, гэта будуць практычныя заданні, мадэляванне рэальных працоўных умоў.

Такая складаная працэдура выбару абумоўленая тым, што "адборных" студэнтаў плануецца прыцягнуць да пастаяннага супрацоўніцтва за неблагія грошы, прытым будзе весціся далейшая праца па ўдасканаленні іх майстэрства – у тэлецэнтры хочуць быць упэўненыя, што сілы, грошы і час будуць патрачаныя на апрацоўку ўрадлівай глебы, а ўзрошчаныя прафесіяналы выдадуць канкурэнтаздольны тэлепрадукт.

Кастынг выявіў і такіх кандыдатаў, чыя кваліфікацыя вышэйшая, чым трэба для вырабу "Студэнцкіх навін", – людзей з немалым прафесійным стажам, якія школу навінавых матэрыялаў прайшлі і здатныя на большае. Іх таксама, як і канкурсантаў першага этапа, запамінаюць – наперадзе ў тэлецэнтра мноства праектаў (тэлепраект "У першым шэрагу", цыкл праграм аб таленавітай моладзі "Золата нацый", запуск з верасня 2009 г. новага штодзённага тэлепраекта ад "Спорт-пары", утварэнне першага афіцыйнага вучэбнага цэнтра "Apple"...). Спрактыкаваныя імпэтныя творцы заўжды прыдадуцца.

Падрыхтавала
Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

УНІВЕРСІТЭТ

29 чэрвеня 2009 года, № 12 (2005)

СВЯТЫ

Баль выпускнікоў-2009

"Ах, вось які ты, выпускны!" – думала я, назіраючы за ўсім, што адбывалася. "Ах, вось бы мне такі!" – марыла я, яшчэ зялёная другакурсніца, у якой, здаецца, усё студэнцкае жыццё наперадзе. І захацелася яшчэ больш шанаваць гэтыя вялізныя аўдыторыі, буфетчыц у сталовай, студэнцкія канцэрты, выезды на прыроду, старэнькага выкладчыка з тоўстымі шкельцамі ў акулярах і бравурнымі вусамі!

19 чэрвеня ў канцэртнай зале ліцэя БДУ прайшла ўрачыстая цырымонія пад кодавай назвай "Баль выпускнікоў". Што такое баль? Лёгкія сукеначкі, стук абцасікаў, гальштучкі, аркестр, і не забудзем пра ўсмешкі, які ж без іх баль? Марылі пра чырвоную дарожку? У БДУ мары спраўджваюцца! Шлях ад тратуара да ўваходу ў ліцэй выслаы самай сапраўднай чырвонай дарожкай, па баках якой падцягнутыя курсанты.

Выпрастай спіну, паднімі галаву і ганарліва прайдзі, лічачы кожны крок. Першы курс, другі, трэці. Чацвёрты. Вось, нарэшце, і пяты. Не забудзь пакінуць пажаданне ўлюбёнаму, як мы любім казаць, "універу"! Для гэтага ёсць адмысловы альбом для будучых пакаленняў: для мяне, для таго, хто будзе пасля мяне і пасля, пасля, пасля...

Нешта стала троху сумна, так? Давайце дадамо фарбаў! Калі ты, студэнт, яшчэ такі ж зялёны і неспрактыкаваны, як і я, то ў цябе ёсць усе шанцы стаць "Найлепшым выпускніком факультэта" або "Зоркай факультэта". Выбірай, што бліжэй, радней, а галоўнае, дзе ўсе твае здольнасці і ўменні змогуць выявіцца лепш за ўсё. Масавік-забаўнік мае ўсе шанцы стаць "зоркай", а пераможца мноства канферэнцый і алімпіяд – "Найлепшым выпускніком". Імкніцеся, і ўсё атрымаецца!

Баль выпускнікоў-2009 быў багаты на ўраджай. Ад колькасці "зорак" зала ліцэя БДУ проста напоўнілася святлом. Павіншаваць выпускнікоў найлепшай ВНУ краіны прыехалі і артысты беларускай эстрады: прыгажун Герман, гурт "Light Sound" і Аня Шаркунова. А напрыканцы вакальна-харавая студыя БДУ выканала гімн студэнцтва "Гаўдэамус". Яшчэ не ведаеце словы? Тады вучыце!

Баль выпускнікоў-2009 працягнуўся ва ўнутраным дворыку ліцэя, дзе былі танцы да ўпаду, вальс, рок-н-рол, успышкі фотакамер, зялёная, але смутная вербачка, смех і слёзы. Было ўсё! І усё будзе наперадзе. У добры шлях!

P.S. Калі б я пакідала пажаданне ў альбоме для будучых пакаленняў, то абавязкова напісала б наступнае: "Я люблю БДУ". І кропка.

Настасся ПЯТРОВІЧ

ВІКТАРЫНА

Падведзеныя вынікі віктарыны сярод студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ, прысвечанай 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Пераможцы:

І месца – Ісаакавіч Дар'я, студэнтка 2 курса ФМА;

ІІ месца – Басавец Стэфаніда, аспірантка ФМА;

ІІІ месца – Каспяровіч Анастасія, студэнтка 2 курса гуманітарнага факультэта.

Лаўрэатамі конкурсу сталі: Чарняўская Марыя (біяфак, 3 курс), Манак Юлія, Скопінава Алена (абедзве – гумфак, 2 курс), Мілеўская Юлія (гістфак, 2 курс), Лойка Марына, Скарлыгін Аляксандр, Шабунеўская Аэла, Ягела Наталля, Жалезная Таццяна, Фамічова Анастасія (усе – гістфак, 3 курс), Градовіч Мікіта (ФПМІ, 2 курс), Мурашка Алена (юрфак, 4 курс).

Пераможцы і лаўрэаты будуць узнагароджаныя адпаведнымі дыпломамі і грашовымі прэміямі. І месца – 350 000 руб., ІІ месца – 250 000 руб.; ІІІ месца – 200 000 руб. Лаўрэатам выплацяць па 50 000 рублёў.

Узнагароджанне адбудзецца 29 чэрвеня ў дзень памяці студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ, якія геаічна змагаліся і аддалі сваё жыццё за вызваленне і незалежнасць Беларусі.

Паводле інфармацыі ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Выпускнік гістарычнага факультэта БДУ гэтага года Алег Аляксеенка ў ліку 10 студэнтаў іншых ВНУ нашай краіны ўдастоены Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Алег скончыў БДУ па спецыяльнасці "Гісторык-палітолаг", сярэдні бал за час вучобы меў 9,75, лаўрэат імянной стыпендыі імя Кандрата Крапівы; член Вучонага савета БДУ; сябра супольнасці маладых навукоўцаў Нацыянальнага універсітэта Украіны імя Т. Шаўчэнкі; лаўрэат гранта шведскага адукацыйнага таварыства "ADUKATAR.NET", узнагароджаны граматамі Міністэрства абароны РБ за перыяд навучання на ваеннай кафедры БДУ. За час вучобы актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці універсітэта: старшыня студэнцкага савета па якасці адукацыі БДУ; старшыня ССЯА гістарычнага факультэта з 2007-2009 гг.; член прафбюро гістарычнага факультэта з 2007-2009гг.; член савета старастаў гістарычнага факультэта і інш. Свае таленты Алег выявіў таксама ў культурнай і спартыўнай галіне.

***

Працы студэнтак 5 курса БДУ Алёны Дакуновай (гістарычны факультэт, навуковы кіраўнік Уладзімір Коршук) і Ксеніі Цыганок (факультэт журналістыкі, навуковы кіраўнік Пётр Дарашчонак) атрымалі дыпломы 1 ступені V Рэспубліканскага конкурсу творчых прац "Вялікая Айчынная вайна ва ўдзячнай памяці беларускага народа", прысвечанага 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Усяго на конкурс было даслана больш за 5 тыс. прац з усёй краіны. З іх да рэспубліканскага тура журы адабрала 101. Дыпломаў жа Міністэрства адукацыі Беларусі ўдастоеныя 45 прац.

Урачыстая цырымонія ўзнагароджання аўтараў-прызёраў адбылася 23 чэрвеня ў зале пасяджэнняў Вучонага савета Белдзяржуніверсітэта з удзелам рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі, першага намесніка міністра адукацыі Аляксандра Жука, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Вучонага савета Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Анатоля Новікава.

***

Прэміяй Мінгарвыканкама ўзнагароджаны студэнты БДУ Алена Матусевіч (5 курс юрыдычнага факультэта), Анастасія Траскевіч (5 курс ФМА) і Міхаіл Сямёнаў (4 курс гістарычнага факультэта). Яны адзначаны за актыўны ўдзел у навуковым, грамадскім і культурным жыцці сталіцы.

Паводе інфармацыі прэс-службы БДУ

УШАНАВАННЕ

Прыступка да новых вышынь

У зале пасяджэнняў Вучонага савета БДУ 18 чэрвеня адбылася цырымонія ўрачыстага ўручэння студэнтам і супрацоўнікам Белдзяржуніверсітэта знакаў лаўрэатаў і пасведчанняў аб заахвочваннях спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

На цырымоніі прысутнічалі рэктар БДУ Сяргей Абламейка, старшыня Савета спецфонду Алена Бялова, першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Аляксандр Жук.

Узнагароды і пасведчанні аб заахвочваннях атрымалі 70 студэнтаў, выпускнікоў, аспірантаў і супрацоўнікаў БДУ, з іх сямёра сталі лаўрэатамі спецыяльнага фонду.

Трое нашых студэнтаў сталі лаўрэатамі фонду за перамогу ў 15-й Міжнароднай студэнцкай алімпіядзе па матэматыцы, якая праходзіла ў 2008 г. у Балгарыі. Для аднаго з узнагароджаных – студэнта 4 курса механіка-матэматычнага факультэта Івана Блізняца гэта ўжо трэцяя выйграная студэнцкая алімпіяда запар і чацвёрты знак лаўрэата.

Таксама атрымалі знакі лаўрэатаў спецфонду студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, якія перамаглі ў 2008 г. на студэнцкім камандным чэмпіянаце свету па праграмаванні (Канада) і ў Міжнародным спаборніцтве праграмістаў (ЗША).

Пасведчанні аб заахвочваннях фонду былі ўручаныя студэнтам і выпускнікам БДУ – пераможцам рэспубліканскіх алімпіяд і конкурсаў, стыпендыятам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Акрамя таго, за важкі ўнёсак у развіццё здольнасцяў адораных навучэнцаў і студэнтаў прэміямі спецыяльнага фонду ўзнагароджаныя 9 супрацоўнікаў ФПМІ БДУ.

Віншуючы ўзнагароджаных і адзначаючы вялікія дасягненні і перамогі нашых студэнтаў, рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка падкрэсліў, што гэтыя поспехі шмат у чым абумоўленыя эфектыўнай працай прафесараў, дацэнтаў, навуковых супрацоўнікаў універсітэта па выяўленні адораных маладых людзей, развіцці іх здольнасцяў, павышэнні ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі моладзі. Рэктар вылучыў працу студэнцкай НДЛ "Паўправадніковыя лазеры" пад кіраўніцтвам кандыдата фізіка-матэматычных навук Івана Манака. Траім яе супрацоўнікам уручаныя ўзнагароды фонду, а сама лабараторыя атрымала ўжо трэцяе пасведчанне аб заахвочванні. У сваёй прамове рэктар падзякаваў прадстаўнікам прэзідэнцкага фонду за высокую ацэнку працы студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ.

З часу стварэння ў 1996 г. спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў 540 студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ былі адзначаныя яго ўзнагародамі больш за 700 раз. Некаторыя з іх маюць па 4, 5 і нават 6 заахвочванняў фонду. Акрамя таго, фондам часта ўзнагароджваліся супрацоўнікі і навучэнцы ліцэя БДУ.

Паводле інфармацыі НДЧ-ГУН

УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 30 жніўня 2005 года

29 чэрвеня 2009 года
Падпісана да друку 26.06.2009 г.
Зак. 714. Тыраж 2000 экз.Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by